МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
**МАГІЛЁЎСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

вул. Першамайская, 28а
212030 г. Магілёў

тэл. (0222) 42 20 33, тэл. (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by

р/р BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МАУ № 700 ААТ ААБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

МОГИЛЁВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**МОГИЛЁВСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

ул. Первомайская, 28а
212030 г. Могилёв

тел. (0222) 42 20 33, тел. (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by

р/с BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МОУ № 700 ОАО АСБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

13.09.2024 № ХА1-2003

на № ____________ ад ________________

[redacted]

Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт (далей – гарвыканкам), разгледзеўшы калектыўны зварот па пытанні нязгоды з узвядзеннем музейнага комплексу і любых іншых аб'ектаў у парку імя Горкага ў г.Магілёве, паведамляе наступнае.

У перыяд з 5 ліпеня 2024 г. па 19 ліпеня 2024 г., у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку правядзення грамадскіх абмеркаванняў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 2011 г. № 687, у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2022 г. № 425, па аб'екце: «Рэканструкцыя парка імя Горкага з узвядзеннем музейнага комплексу і добраўпарадкаваннем тэрыторыі ў г.Магілёве» (далей – аб'ект) гарвыканкамам праведзена грамадскае абмеркаванне архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі аб'екта форме інфармавання юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і вывучэння грамадскай думкі.

На пасяджэнні пастаянна дзейнай камісіі па правядзенні грамадскага абмеркавання ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці прынята рашэнне, што грамадскае абмеркаванне ў форме інфармавання юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і аналізу грамадскай думкі архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі аб'екта праведзены ў адпаведнасці з заканадаўствам, з улікам рэкамендацый архітэктурна-горадабудаўнічай рады пры кіраванні архітэктуры і горадабудаўніцтва гарвыканкама, а таксама з улікам меркавання грамадскасці, архітэктурна-планавальную канцэпцыю аб'екта прыняць да наступнага праходжання экспертыз і ўзгадненні, а таксама прадугледзець у рамках добраўпарадкавання

тэрыторыі наяўнасць гістарычных архітэктурных элементаў, якія знаходзяцца ў кампазіцыйным узаемадзеянні з аб'ектам.

Аб'ект размешчаны ў межах праекта зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гістарычны цэнтр г.Магілёва» і нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі гістарычнага цэнтра г.Магілёва і прылеглых кварталаў» (далей – праект зон аховы), зацверджанага пастановай Міністэрствы культуры Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2023 г. № 92, і не парушае ўстаноўленыя ім рэгламенты.

У адпаведнасці з пунктам 60 раздзела 6 праекта зон аховы, у зоне аховы культурнага пласта забараняецца правядзенне будаўнічых і земляных прац без прыняцця мер па ахове археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў у парадку, усталяваным заканадаўствам.

Згодна з артыкулам 105 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь, усе віды работ у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей выконваюцца ў межах патрабаванняў рэжымаў утрымання і выкарыстання зон аховы.

Таксама паведамляем, што 11 верасня 2024 г. у 14:20, у будынку гарвыканкама па адрасе: г.Магілёў, вул.Першамайская, 28а, 3 паверх, каб.320 была арганізавана і праведзена сустрэча з прадстаўніком ініцыятыўнай групы па пытанні нязгоды з узвядзеннем музейнага комплексу і любых іншых аб'ектаў у парку імя Горкага ў Магілёве. У ходзе гэтай сустрэчы прадстаўніку ініцыятыўнай групы дадзены адказы на пастаўленыя пытанні.

У выпадку нязгоды з дадзеным адказам у адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» Вы маеце права абскардзіць яго ў Магілёўскі аблвыканкам (г.Магілёў, вул.Першамайская, 71) .

Першы намеснік старшыні І.В.Бушлякоў

Гумен 423041
Клепчукова М.В.
Путро В.Л.
Конеў А.А.
Лаппо П.П.